*УДК 392.1(476.2)*

**А. М. Рэшанок**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

У артыкуле, прысвечаным радзінна-хрэсьбінным абрадам і звычаям аднаго з раёнаў Гомельскай вобласці – Гомельскага раёна, раскрываюцца рэгіянальна-лакальныя асаблівасці радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу. Аўтар, выкарыстоўваючы ўласныя экспедыцыйныя і архіўныя матэрыялы, характарызуе асноўныя структурныя кампаненты і звязаныя з імі рытуалы.

Нараджэнне дзіцяці – важны момант у жыцці кожнага чалавека, таму з даўніх часоў беларусы вельмі сур’ёзна адносіліся да выканання рытуалаў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Асноўныя структурныя кампаненты радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу: прыкметы і павер’і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, выбар кума і кумы, падрыхтоўка бабкай-павітухай абрадавай стравы – кашы, абрад хрышчэння дзіцяці, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання гаршка з кашай, дзяльба кашы, рытуалы ўшанавання бабкі-павітухі, адорванне падарункамі бабкі і жанчыны-парадзіхі [1, с. 8]. Звернемся непасрэдна да фактычных матэрыялаў па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, запісаных летам 2014 г. у палявой экспедыцыі на тэрыторыі Гомельскага раёна, а таксама да архіўных матэрыялаў навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі, і прааналізуем іх.

З радзінна-хрэсьбіннай абраднасцю цесна звязаны шматлікія прыкметы і павер’і, у якіх адлюстраваліся міфалагічныя ўяўленні нашых продкаў. Асаблівае месца адводзілася народным вераванням, паводле якіх здароўе і шчасце дзіцяці залежалі ад паводзін цяжарнай жанчыны, будучай маці. Нельга не пагадзіцца з трапным выказваннем даследчыка С. А. Фядосіка, што «ва ўсіх народаў свету існавалі пэўныя традыцыйныя правілы, забароны і засцярогі паводзін цяжарнай жанчыны, якія павінны былі аблегчыць роды, садзейнічаць здароўю і шчасцю нованароджанага ў будучым. Але ў розных народаў гэтыя правілы і засцярогі былі ў значнай частцы адметныя, часам нават мелі неаднолькавы семантычны сэнс пры падобных дзеяннях» [2, с. 26]. Засяродзім увагу на фактычных матэрыялах, напрыклад, паводле

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўспамінаў жыхароў Гомельскага раёна, цяжарнай жанчыне забаранялася што-небудзь рэзаць або секчы: *«Цяжарнай іменна нельзя было ў празнік ні секць нічога, ні рэзаць нічога. Нічаво! Самае глаўнае, ежалі беременная жэншчына, вот слухайце, не дай Бог, абыйдзіся ў празнік: не адсякай, не рэж нічаво»* (запісана ў в. Старыя Дзятлавічы ад Ткачовай Алены Варфаламееўны, 1929 г. н.). Цяжарныя жанчыны пазбягалі красці, здзіўляцца з людзей з фізічнымі недахопамі: *«Нельзя было тежарной воровать, потому что у ребенка родимое пятно будет. Когда испугаешься, не дай Бог ухватиться за лицо, потому что как схватишься, так и останется на ребенке такое пятно. Еще нельзя на людей смотреть некрасивых, потому что ребенок будет некрасивый»* (запісана ў в. Грабаўка ад Белавус Ларысы Рыгораўны, 1936 г. н., перасяленкі з в. Пагоннае Хойніцкага р-на).

Галоўнымі персанажамі ў выкананні рытуалаў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці з’яўляліся бабка-павітуха, кум і кума. Асаблівая роля адводзілася бабцы-павітусе, якая, лічылі, павінна была прысутнічаць падчас родаў жанчыны і дапамагаць ёй. Інфарманты з в. Рудня-Марымонава пацвердзілі важнасць прысутнасці бабкі-павітухі менавіта ў момант нараджэння дзіцяці: *«Ражалі дома, таму што бальніц не было. Але былі такія бабкі, называліся яны “бабкі-спаветушкі”. Ну ўжэ калі схваткі начынаюцца, у нас на дзярэўні тут была бабка-спа- ветушка. У мяне, калі мама ражала, так тады пасылалі тую бабку, і яна прыбягала, нада ж малітву прачытаць і знаць, як пупавіну завя- заць. Но яны вот этыя бабкі самі па сабе ўжэ знаюць, як абрэзаць пупавіну і завязаць яе, штоб жа грыжа не была. Ну, а тады ж ужэ ўсё этая бабка здзелае, а потым бралі старыя трапкі палатняныя і дзіцёнку і рукі, і ногі пазвязываюць, а яно ляжыць, як паленца»* (запі- сана ад Марымонавай Таісіі Дзямідаўны, 1941 г. н.).

Паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў, бабка-павітуха спавівала дзіця або ў матчыну сарочку, або ў бацькавы штаны: *«Была і бабка-павітуха. Дак гэта ж бабка ужэ ж тая, што бабіла ўжэ ж баба тады ж. Эта ж цяпер ужо ў бальніцы, а тады ж бабка спавівала. А пялёнак жа не было, то сарочку палатняную раздзяром, то штаны яго – да ўжэ ўверцім»* (запісана ў в. Старыя Дзятлавічы ад Ткачовай Алены Варфаламееўны, 1929 г. н.).

Важнае значэнне надавалі рытуалу хрышчэння дзіцяці: *«Ой, дзеткі мае! Хрысцілі. Пайшлі пахрысцілі кум і кума»* (запісана ў в. Старыя Дзятлавічы ад Ткачовай Алены Варфаламееўны, 1929 г. н.). Звычайна хадзілі хрысціць кум і кума: *«У цэркву прыйшлі ўсе, кум і кума. Раздзелі дзіця, от так голенькае. Бацюшка ўзяў яе і тры разы абдаў яго, а тады ў палаценца, выцерлі, адзелі, а тады малітву і*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*крэсцечак сразу павесіў. Бацюшку – палаценца, грошы плоцім. Маць хрэсная і ацец глаўнее сваіх родных. Аны далжны ўжэ васпітываць, усё врэмя ім падсказваць, вучыць, усё. Тады ўжо рабёнак прабудзе месяцаў пяць, тады нада несці зноў у цэркву. Узяць малітву. Тады бацюшка малітву чытае і моліцца. Эта абязацельна»* (запісана ў в. Церуха ад Майсеевай Ніны Аляксандраўны, 1935 г. н.*).*

Як сведчаць экспедыцыйныя матэрыялы, важнае месца ў сістэме радзінна-хрэсьбіннай абраднасці меў абрад разбівання гаршка з кашай. Звычайна яго выконваў кум, паводле іншых звестак – хто-небудзь з гасцей або бабка-павітуха: *«Ужэ бралі гаршок троху біты, а ўнутры гасцінцаў наложаць, а еслі ўжэ і баба такая, што ізварыць харошую кашу, укусную, дак яна і дзействіцельна кашу наварыць, абмотвалі яе, і хто болей грошай дасць, той бярэ палачку да й б'е. Той, хто ўжэ разаб'е, таго і каша. Разбіваў не толькі кум, а када хто»* (запісана в. Старыя Дзятлавічы ад Максіменка Вольгі Рыгораўны, 1934 г. н.)*; «Баба кашу з рыса варыць, б'е. Асколачак нада хаваць. Ба- ба к каждаму прыходзіць і гавора: "Папробуйце маей кашы. І лажы- це на кашу!" І шчэ раз круг і трэцці. Кумоў нада браць родственікаў. Кума не далжна быць цяжарная»* (запісана ў в. Церуха ад Майсеевай Ніны Аляксандраўны, 1935 г. н.). Зыходзячы з успамінаў Алены Варфаламееўны Ткачовай, 1929 г. н., *«бабу на баране не каталі. Баба кашу біла. Тады ж капейкі, мае дзеткі, былі. Кашу паставяць у гаршку, ды туды пячэння ўжэ ўсыпле, а так ужэ стаіць, кажа: "Мая каша, я болей дам". Баба зноў дваццаць капеек кіне – бабіна каша. Тады зноў таргуюцца: "Чыя каша?" Эта кіне трыццаць капеек – яе каша. "Нет!" – кажа, а баба зноў капейку – бабіна каша»* (запісана ў в. Старыя Дзятлавічы).

Магічнае значэнне надавалі чарапкам ад разбітага гаршка з кашай: *«Кашу дзелалі, а патом кум кашу разбівае, а тады гэтыя чарапкі бралі і лажылі і куму, і куме на голавы, штоб яшчэ ў іх былі дзеці»* (запісана ў в. Рудня-Марымонава ад Марымонавай Таісіі Дзямідаўны, 1941 г. н.); *«Гліняныя чарапкі кладуць незамужнім на галаву, каб нарадзілі дзіця. Гліняныя чарапкі бралі дамой і клалі на акно. Верылі, што гэта засцярога ад грома»* (в. Макаўе) [1, с. 178]. У в. Даўгалессе гэтыя чарапкі захоўвалі кум і кума, *«пакуль жылі хрэснікі»* [1, с. 174]. Паводле сведчанняў жыхаркі в. Краўцоўка, *«чарапочкі чаго-та шыбалі, у каго пападзе. А чаго – я ўжэ не скажу. А так іх выкідалі туда, дзе ніхто не ходзіць»* [1, с. 177]. У п. Мірны, *«калі не было доўга дзяцей, гэтыя чарапкі бралі з сабой, а хто первы раз гуляе, тыя бралі і грызлі чарапок зубамі, каб зубы крэпкія былі»* [1, с. 179].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прыведзеныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы дазваляюць зрабіць высновы, што радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі Гомель- скага раёна адрозніваюцца непаўторным багаццем прыкмет і па- вер’яў, а таксама вылучаюцца адметнымі рытуаламі.

**Спіс літаратуры**

1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-ўкладальнікі Новак В. С., Шын- карэнка В. К., Кастрыца А. А., Воінава А. М., Вяргеенка С. А., Палу- ян А. М., Партнова-Шахоўская А. У. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с.

2 Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; Навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мн. : Бел. навука, 2001. – 422 с.

3 Фядосік, А. С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А. С. Фядосік / Навук. рэд. А. С. Ліс. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 1997. – 126 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ